Как видно, поэт для М. Цветаевой неразрывно связан с речью, то есть поэт – это тот, кто произносит речь, что коррелирует с первым определением слова «поэт». В ключевых лексемах *поэт* и *заводить* выявляются семы *деятельность, динамика, творчество*. Данные семы находят дальнейшее воплощение в стихотворении в лексеме *путь*, которая имеет широкий спектр символических коннотаций: *Ибо путь комет – / Поэтов путь. Развеянные звенья / Причинности – вот связь его! Кверх лбом – / Отчаетесь! Поэтовы затменья / Не предугаданы календарем*.

Лексемы *кометы, затменья* позволяют выявить авторскую концептуализацию *«поэт – комета»*, которая связана с ассоциативными полями *«природа и космос»*, пробуждает у человека неудержимое стремление к красоте, гармонии с миром. Лексема *космос*, как известно, в переводе с греческого означает «порядок, строй, мир», что актуализирует сему *гармония*. Поэт – нечто неуловимое, тот, за кем никто не успевает. Он на шаг впереди всего, напоминание о том, что уже не догнать. Расширяя смысл данного понятия, М. Цветаева наполняет его индивидуально-авторскими ассоциациями и коннотациями.

Таким образом, все сказанное выше – лишь «вершина айсберга», название которому – творчество М. Цветаевой. «Безмерность моих слов – только слабая тень безмерности моих чувств», – писала поэт [3]. Действительно, комбинируя и интерпретируя значения слов, поэтесса стремилась выразить своё восприятие непостижимости, загадочности бытия, судеб, устремлений, чувств, ощущений – всего того, что в совокупности дает представление о жизни, о потоке времени, поэте и поэзии.

## Литература


1. *Танк, М.* Избранное / М. Танк. – Минск : Маст. літ., 1999. – 398 с.
2. *Цветаева, М. И.* Избранные произведения / М. И. Цветаева. – М. ; Л. : Сов. писатель, 1965. – 812 с.
3. *Цветаева, М. И.* Искусство при свете совести / М. И. Цветаева // Световой ливень : публицистика. – М., 2001. – С. 106–109.



*Ж. В. Косціна (Беларусь)*


# АКТУАЛЬНАСЦЬ АНАЛІЗУ ЭСТЭТЫЧНАГА ІДЭАЛУ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ У СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВЕ

Мастацтву і літаратуры часоў Рэнесансу, Класіцызму і Барока, культурам традыцыйнага тыпу, ацэнкі даследчыкаў былі не патрэбныя. Творцы дзейнічалі

па пэўнаму канону ці па ўзаконенай традыцыі, якія надзейна вызначалі майстроў мастацтва і ацэнку іх прадукту. Калі традыцыя і канон сталі страчваць свой уплыў і мастак авалодаў правам самастойна выбіраць змест і форму твораў, а чытач асабіста ацэньваць іх, узнікла патрэба ў стварэнні механізмаў, якія б уздзейнічалі на стваральнікаў мастацкіх каштоўнасцей. Так узнікае мастацкая крытыка – «экспертыза» якасці твора, разуменне задумы пісьменніка і рэалізацыя гэтай задумы ў вызначанай форме. М. С. Каган, савецкі філосаф сцвярджаў: «Істотнае адрозненне стану творчасці і ўспрымання мастацтва ў культуры Новага часу – іх залежнасць ад новага яе дзецішча, якое завецца мастацкай крытыкай» [3, с. 485]. Любы крытык з'яўляецца часткай культуры, якая сфарміравала яго свядомасць, густ, інтарэсы. Таму пазіцыя даследчыка выпрацоўвае абагуленыя прынцыпы ўспрыняцця мастацкіх тэкстаў на сучасным яму гістарычным этапе. Крытык імкнецца садзейнічаць выпрацоўцы эстэтычных прынцыпаў сучаснага яму мастацтва і тым самым далучаецца да стварэння эстэтычнага ідэалу пэўнай эпохі.

Яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя Ё. Г. Фіхтэ, вызначаючы воблік сваёй эпохі, адзначаў: «Вобраз мыслення трэцяй эпохі будзе, сказаў я, імкнуцца да агульнага распаўсюджання і ў вызначанай ступені дасягне гэтага, так што ўся эпоха пераўтворыцца ў ваенны лагер фармальнай навукі. – Хто камандуе ўсім гэтым лагерам і кіруе тут масамі? Канешне, адкажуць на гэта, – перадавыя байцы, у якіх найбольш багата раскрыўся дух часу. <…> Асноўная максіма іх заняткаў такая: ва ўсім знаходзіць якія-небудзь недахопы і кожны прадмет ведаць лепш, чым ведае яго разглядаемы аўтар» [10, с. 75, 77]. Такімі перадавымі байцамі былі літаратурныя крытыкі.

Ганна Мікалаеўна Кісліцына, разглядаючы эстэтычныя прынцыпы сучаснай беларускай крытыкі, сцвярджае, што «беларуская літаратурная крытыка прайшла доўгі, амаль стогадовы шлях. На ім былі свае ўзлёты і падзенні, якія вымяраюцца, хутчэй за ўсё, градусам праўды – здольнасцю фіксаваць і адлюстроўваць не толькі з'явы бягучага літаратурнага працэсу, але і ўласна-эстэтычныя, грамадска-палітычныя, духоўна-філасофскія аспекты жыцця» [6, с. 165].

Літаратура Беларусі першай паловы XIX стагоддзя пачынала вывучацца самімі маладымі творцамі. Пачынальнікамі новай беларускай літаратуры былі выхаванцы Віленскага ўніверсітэта: Адам Міцкевіч, «беларускія творы якога не захаваліся, але ён быў прарокам нашай літаратуры» [2, с. 259], Ян Чачот, Тамаш Зан. Іх настаўнікамі былі паляк Піліп Нэрыюш Галяньскі, галічанін Эўзэбіюш Славацкі, беларус Лявон Бароўскі, беларускі літовец Анёл Доўгірд. Арыгінальная эстэтычная і філасофская думка, сфарміраваная навукоўцамі-выкладчыкамі Віленскага ўніверсітэта паўплывала на змест і форму мастацкіх тэкстаў беларускай літаратуры, бо «прадстаўнікі ранняга беларускага рамантызму – Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Рамуальд Падбярэзскі многаму навучыліся ў Эўзэбіюша Славацкага і Лявона Бароўскага. Зусім верагодна, што В. Каратынскі, В. Дунін-Марцінкевіч, А. Вярыга-Дарэўскі і іншыя пачынальнікі новай беларускай літаратуры па іх кнігах вывучалі эстэтыку і літаратуразнаўства, бо гэта былі добрыя падручнікі таго часу ў Беларусі, Літве і Польшчы» [6, с. 279].

У сценах Віленскага ўніверсітэта ў тайным згуртаванні філаматаў быў створаны літаратурны аддзел, які ўзначаліў Ян Чачот. «Ён вельмі актыўна ўзяўся за згуртаванне мясцовых творчых сілаў, за выхаванне літаратурнай моладзі, з вялікай патрабавальнасцю ставячыся да яе творчасці, за што маладыя літаратары назвалі яго Ментарам» [11, с. 11]. У «Рэцэнзіі на твор Адама Міцкевіча «Курганок Марылі»», які быў прачытаны на пасяджэнні сяброў 28 лістапада 1820 года малады крытык, аналізуючы моўныя асаблівасці і даючы парады па выпраўленні хібаў, вызначыў жанр твора – элегія: «Мілая сентыментальнасць, меланхолія, выразы, поўныя сапраўдных пачуццяў, даюць усе падставы сцвярджаць, што гэта сапраўдная выдатная элегія» [11, с. 204]. Эстэтычная ж ацэнка дадзенага твора: «Найцудоўнейшая ідылія!» [11, с. 204]. Найцудоўнейшая яна і з той прычыны, што трымаецца арыгіналу народнай літоўскай песні, хоць самой першакрыніцы Чачот не ведаў. Эстэтычнай каштоўнасцю для Яна з Мышы была праўдападобнасць, блізкасць да першатэксту. Гэту эстэтычную норму ён раскрывае на пачатку балады «Svіцязь», дзе ў лірычных адступленнях ушчувае Адама Міцкевіча за індывідуальную інтэрпрэтацыю падання пра з'яўленне возера: «Бо шмат ад сябе ты, Адаме, / Наплеў пра часіны былыя. / Усе ж занядбаўшы паданне, / Якое данеслі старыя. / Яго чуў Тамаш у народзе / І мне перадаў пры нагодзе» [11, с. 132]. Ян Чачот з'яўляўся носьбітам народнай свядомасці, у сваёй літаратурнай і навуковай творчасці да выгнання і пасля ён трымаўся фальклорнай традыцыі, бо бачыў у фальклоры эстэтычны ідэал мастацкай літаратуры.

Уладзімір Міхайлавіч Конан, сучасны філосаф у артыкуле «Хараство народных ідэалаў: ля вытокаў беларускай эстэтычнай думкі» сцвярджаў: «Для фальклорнай маральна-эстэтычнай канцэпцыі розум, праца, гераізм, самаадданасць і іншыя катэгорыі гэта не самамэта, а сродак для перамогі на зямлі царства справядлівасці як абсалютнай каштоўнасці, канчатковай мэты жыцця. Адным словам, праўда – гэта эстэтычны ідэал у яго найбольш агульнай форме, гэта адзінства ісціны, дабра і красы» [4, с. 131].

Максім Багдановіч у артыкуле «За сто лет» канстатаваў, што пачатак новай беларускай літаратуры звязаны са з'яўленнем інтэлігенцыі. Яна выходзіла з краёвай шляхты, якая атрымала адукацыю ў Віленскім універсітэце. Малады даследчык вызначае асноўную эстэтычную каштоўнасць літаратурных прац пачатку XIX стагоддзя – краёвы патрыятызм. Максім Багдановіч акрэслівае элементы мастацкага свету, якія прадстаўляюць краёвы патрыятызм: «… Не Варшчаўшчына, не Кракаўшчына, а наша беларуская зямля, беларускія казкі і песні, што чулі яны змалку, пушчы, азёры і рэкі нашага краю, народ беларускі, паміж каторага яго ўзгадаваліся, нават беларуская мова, да каторай яна была прыхільна ў хатніх гутарках старасвецкай шляхты, – усё гэтае зраслося з іх душою, і згадаўшы аб роднай старонцы, Беларусь бачылі яны» [1, с. 209]. У артыкуле «Забыты шлях» Багдановіч, акрэсліваючы «народны дух» літаратуры, што можна атаясамліваць з паняццем «эстэтычны ідэал», адзначаў яго ў «Чачота ды Петрука з-пад Крошына, ды яшчэ, быць можа, Баршчэўскага» [1, с. 287].

Менавіта як гісторык літаратуры, тэарэтык беларускага літаратурнага працэсу паўстае Максім Гарэцкі ў адборы тых прадстаўнікоў шматмоўнага мастацтва слова Беларусі XIX стагоддзя, якія, на яго думку, прадстаўлялі сапраўдную творчасць, бо яно «адбівала тагачаснае народнае жыццё». Сучасныя літаратуразнаўцы ў асобных даследаваннях указваюць эстэтычныя каштоўнасці, якія складаюць змест і форму эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. А. Яскевіч дае слушную ацэнку паэзіі беларускіх пачынальнікаў: «З засваеннем экзістэнцыйнай культуры, што ў існым сэнсе разумення ўяўляе прарыў з побытава-абыдзённага існавання да вызначальна трансцэндэнтных рэальнасцяў быцця (ад нараджэння праз усе «пагранічныя» жыццёвыя станы да смерці і пераходу ў вечнасць), нацыянальнае мастацтва набывае агульначалавечую глыбіню без боязі выяўлення «безданяў» жыцця і пакутлівых «вечных тэм», на аснове біблейскага праведыянцыялізму вырашае перспектыву чалавека, гісторыі і Сусвету. З заснаваным на высокапатрабавальнай хрысціянскай духоўнасці эстэтычным ідэале маладое нацыянальнае мастацтва набывала існую аб'ёмнасць у выяўленні жыцця, а галоўнае маральнае здароўе, высокую ідэальнасць, што ўжо само па сабе засцерагала яго ад упадніцкай пошасці дэкадансу, якім гэтак рашуча размежаваў мастацкія пазіцыі В. Каратынскі ў сваім эстэтычным маніфесце» [12, с. 30].

На пачатку XXI стагоддзя беларускія даследчыкі, асэнсоўваючы вопыт літаратуразнаўчай думкі, выказваюць неабходнасць разгляду любой мастацкай з'явы ва ўзаемадзеянні розных мастацка-эстэтычных сістэм, напрамкаў. На думку В. Максімовіча, які даследаваў літаратуру пачатку XX стагоддзя, асноўнай кропкай каардынатаў эстэтычных пошукаў прадстаўнікоў гэтага перыяду з'яўляецца «субстрактная ідэя – ідэя прапаганды народнай культуры, шанаванне мовы, развіццё ўласных нацыянальных формаў пры адначасовым прызнанні факта знешніх уплываў і ўздзеянняў» [5, с. 22].

Беларуская літаратурная крытыка 2010-х і па сёння актыўна аперыруе паняццямі эстэтычнае, прыгожае. Аналізуючы творчасць Максіма Гарэцкага, І. В. Саверчанка звяртаецца да раскрыцця эстэтычных дамінант твораў класіка: «Галоўная рыса эстэтыкі М. Гарэцкага – адлюстраванне цяжкасцей і выпрабаванняў, якія выпалі на долю яго пакалення. Пісьменнік робіць акцэнт на змрочных і непрыглядных баках жыцця. Нязменная ўвага майстра слова да драматычнага разладу ў душах герояў» [7, с. 4]. Характарызуючы мастацкія адкрыцці Якуба Коласа, даследчык акцэнтуе ўвагу на «вызначальнай рысе эстэтыкі генія нацыянальнай літаратуры» [8, с. 136], якая падкрэслівае аптымістычны погляд на чалавека і грамадства, веру ў выдатную будучыню роднага краю. Іван Васільевіч лічыць, што Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч ствараў літаратурныя тэксты на беларускай мове, якія «сталі выдатным узорам адметнай рамантычнай эстэтыкі і бліскучым мастацкім увасабленнем новай творчай стратэгіі, заснаванай на каштоўнасцях народнай культуры» [9, с. 141].

Такім чынам, сучаснае беларускае літаратуразнаўства актыўна факусіруе сваю ўвагу на вывучэнні складанай эстэтычнай катэгорыі – эстэтычны ідэал.

Айчынныя крытыкі імкнуцца ўлічваць аксіялагічныя каштоўнасці беларускага народа, увасобленыя ў мастацкіх творах. Гэта традыцыя была распачата яшчэ ў XIX стагоддзі, дзякуючы паэтам-рамантыкам.

## Літаратура


1. *Багдановіч, М.* Поўны збор твораў : у 3 т : / М. Багдановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – Т. 2 : Маст. проза, пераклады, літаратурныя артыкулы, рэцэнзіі і нататкі, чарнавыя накіды. – 600 с.
2. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. – Мінск : Беларус. навука, 2017. – Т. 4 : Асветніцтва. – 431 с.
3. *Каган, М. С.* Эстетика как филасофская наука / М. С. Каган. – СПб. : ТОО ТК «Петрополис», 1997. – 544 с.
4. *Конан, У. М.* Выбранае / У. Конан ; уклад. М. А. Козенкі. – Мінск : Смэлтак, 2009. – 536 с.
5. *Максімовіч, В. А.* Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя / В. А. Максімовіч. – Мінск : Аракул, 2000. – 348 с.
6. Міждысцыплінарныя даследаванні актуальных праблем тэорыі літаратуры / М. А. Тычына [і інш.] ; навук. рэд. М. А. Тычына ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 396 с.
7. *Саверчанка, І. В.* Мастацкія і эстэтычныя дамінанты твораў Максіма Гарэцкага / І. В. Саверчанка // Род. слова. – 2012. – № 1. – С. 4–8.
8. *Саверчанка, І. В.* Геній нацыі / І. В. Саверчанка // Полымя. – 2012. – № 11. – С. 129–136.
9. *Саверчанка, І. В.* Жыве паміж намі дудар наш… / І. В. Саверчанка // Полымя. – 2015. – № 8. – С. 141–148.
10. *Фихте, И. Г.* Основные черты современной эпохи. / И. Г. Фихте. – СПб. : Д. Е. Жуковский, 1906. – IV, 232 с.
11. *Чачот, Я.* Выбраныя творы ; уклад. К. Цвірка. – Мінск : Беларус. кніга-збор, 1996. – 374 с.
12. *Яскевич, А. С.* Природа в свете Библии / А. С. Яскевич. – Минск : Царкоўнае слова, 2003. – 167 с.


*И. П. Кудреватых (Беларусь)*

# КОММУНИКАТИВНЫЕ НЕУДАЧИ КАК ПОКАЗАТЕЛЬ РЕЧЕВОЙ КУЛЬТУРЫ

Одна из составляющих национального самосознания – чувство гордости за свой язык, отражающий духовное развитие народа, его традиции и культуру. Однако искусство слова, к которому еще до 80-х гг. XX ст. так небезразлично относилось наше общество, утратило сегодня свои ценностные характеристики, противопоставив «великому и могучему» небрежное городское просторечие. Речевая